# Міхаіл Якаўлевіч Фінберг:

## да 60-годдзя з дня нараджэння

Біяграфія Міхаіла Якаўлевіча Фінберга пачалася ў разбураным пасляваенным Мазыры. Ужо ў раннім дзяцінстве праявілася яго любоў да музыкі. Нягледзячы на цяжкае матэрыяльнае становішча, бацькі аддалі Міхаіла ў Мазырскую музычную школу. Там ён пачаў іграць на скрыпцы, але праз тры гады вырашыў іграць на духавых інструментах. Дзесяць гадоў было аддадзена арміі і працы ў вайсковым духавым аркестры, пяць гадоў — у эстрадна-сімфанічным аркестры Беларускага радыё і тэлебачання пад кіраўніцтвам Б. Райскага. У 1970 годзе М. Фінберг скончыў Беларускую кансерваторыю па класу трамбона і ўзначаліў аркестр Мінскага цырка. Менавіта пад кіраўніцтвам маэстра аркестр хутка дасягнуў значных творчых поспехаў і паступова са спецыфічна цыркавога ператварыўся ў канцэртны калектыў. З 1971 года М. Я. Фінберг пачаў выкладаць у Беларускай кансерваторыі (цяпер Беларуская акадэмія музыкі), напісаў дзве навуковыя працы — дапаможнікі для студэнтаў-музыкантаў.

У 1970-я гады Міхаіл Фінберг шмат аранжыруе, піша музыку больш як да 150 цыркавых спектакляў. Працягвае займацца сваёй музычнай адукацыяй у аспірантуры кансерваторыі, дзе дасканала авалодвае сакрэтамі дырыжорскай тэхнікі. У кансерваторыі М. Фінберг сфарміраваў студэнцкі эстрадны аркестр з маладых таленавітых музыкантаў. Многія з іх увайшлі ў Дзяржаўны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь, які быў створаны 21 лютага 1987 года (з 2005 г. — Нацыянальны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі). Галоўныя напрамкі дзейнасці аркестра — папулярызацыя беларускай народнай песні, інструментальнай і джазавай музыкі, пошук і адкрыццё новых імён. У рэпертуар аркестра ўваходзяць праграмы з твораў А. Міцкевіча, М. Багдановіча, А. Куляшова, Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, У. Някляева, В. Аколавай, песенны вянок на вершы Янкі Купалы і Якуба Коласа да 120-годдзя з дня нараджэння паэтаў.

Сярод праектаў М. Фінберга — міжнародныя фестывалі, канцэрты, аўтарскія вечары, выступленні з таленавітымі дзецьмі. З 1993 года Дзяржаўны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі працуе на нацыянальных фестывалях паэзіі і песні ў Маладзечне. Там жа адбылася прэм'ера «Анталогіі беларускай паэзіі і песні», да якой кіраўнік калектыву ішоў амаль што 20 гадоў. Прагучала больш за 30 лепшых твораў беларускіх паэтаў і кампазітараў XVI—XX стагоддзяў.

*Працяг на с. 46.*

Пачатак на с. 20.

Таму невыпадкова, што грамадскасць з ухваленнем сустрэла прысуджэнне Міхаілу Якаўлевічу Фінбергу Дзяржаўнай прэміі Беларусі за 1996 год як аднаму з найбольш актыўных прапагандыстаў нацыянальнай музыкі. У 1997 годзе яму было прысвоена званне прафесара.

Фестывальную геаграфію аркестра М. Фінберга складаюць таксама Мсціслаў, Мір, Тураў, Заслаўе, Нясвіж — гарады, адметныя сваёй самабытнай мінуўшчынай, старадаўняй духоўнай, культурнай спадчынай. Там адбываліся фестывалі камернай музыкі. Надзвычайную папулярнасць у нашай рэспубліцы і ў многіх краінах блізкага і далёкага замежжа аркестр набыў дзякуючы фестывалям — славутаму «Славянскаму базару» ў Віцебску і маскоўскаму «Прыступка да Парнаса», праграмам «Спяваем разам з аркестрам», «Угадай мелодию», выступленням на італьянскім тэлебачанні, адзначаным Гран-пры. Да гэтага яшчэ трэба дадаць працу ў канцэртнай зале «Расія», а таксама ўдзел у праграме «Плошча зорак». У Маскве была закладзена і зорка Міхаіла Фінберга, і, як адзначаў сам маэстра, гэта вынік дзейнасці ўсяго аркестра, усёй краіны.

Няспынныя рэпетыцыі, гастрольныя паездкі і канцэрты — у гэтым жыццё і сэнс дзейнасці слыннага дырыжора. Стымулам жа застаюцца аншлагі, пры якіх заўсёды адбываюцца выступленні Нацыянальнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь.

***К. Дз. Варанько,***
*вядучы бібліёграф*
*Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*